

# ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАВЕДАЕ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ КІТАЙ, ДЗЕ ПРОЙДУЦЬ САМІТ ШАС І ВАЕННЫ ПАРАД

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЖНІЎНЯ 2025 г. СУБОТА № 167 (30555)

# ДОБРАГА ШЛЯХУ Ў КРАІНУ ВЕДАЎ

*Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам*

***Дарагія сябры!***

Сардэчна віншую вас з Днём ведаў.

Першага верасня — асаблівая дата ў календары для кожнага беларуса. Дзень, калі ўся краіна адзначае пачатак новага навучальнага года, а нашы дзеці з трапятаннем і хваляваннем прыходзяць у школьныя класы, аўдыторыі каледжаў і ВНУ.

Але самая пільная ўвага сёння да першакласнікаў і першакурснікаў, якія адчыняюць дзверы ў дзіўны свет ведаў і прафесійнага станаўлення. Няхай гэты час будзе прадукцыйным і захапляльным, а атрыманая адукацыя — трывалым падмуркам далейшай кар'еры.

Традыцыйна звяртаюся да настаўнікаў і бацькоў. У вашых руках будучыня краіны. Вам даверана адказная місія — выхаваць усебакова развітога чалавека, дапамагчы рэалізаваць сябе і навучыць любіць Радзіму. Упэўнены, вы гэта добра разумееце і прыкладзяце ўсе намаганні, каб нашы дзеці раслі дастойнымі грамадзянамі, а родная Беларусь мацнела і працвітала.

Няхай будучы навучальны год прынясе радасць адкрыццяў, стане плённым і па-сапраўднаму шчаслівым для кожнага з вас.

Жадаю вам поспехаў, моцнага здароўя і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




**Басейн, цір, трэнажорная зала, музей, дзясяткі гурткоў, спартыўных секцый і не толькі прапаноўвае вучням новая школа ў Фаніпалі**

СТАР. 10

ШТО ЗМЕНІЦЦА З 1 ВЕРАСНЯ?

7




ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

## СПРАВА САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

**Пабывалі ў салігорскай шахце, паглядзелі, як здабываецца экспартнае багацце краіны**

Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларуськалій» уваходзіць у лік буйных прадпрыемстваў нашай краіны. Яго гонар — гэта статус аднаго з найбуйнейшых вытворцаў калійных угнаенняў у свеце, шырокая экспартная геаграфія — больш за 130 краін, вялікі штат супрацоўнікаў — больш за 16 тысяч чалавек, а таксама значны ўнёсак у сацыяльную інфраструктуру рэгіёна. За кошт прадпрыемства будуецца жыллё для работнікаў і дзіцячыя садкі, вядзецца рэканструкцыя санаторыяў і інтэрнатаў.

СТАР. 8–9



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25167>

9 771990 763008

АФІЦЫЙНА

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАВЕДАЕ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ КІТАЙ, ДЗЕ ПРОЙДУЦЬ САМІТ ШАС І ВАЕННЫ ПАРАД

Кіраўнік дзяржавы 31 жніўня — 1 верасня ў горадзе Цяньцзінь возьме ўдзел у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, які стане найбуйнейшым за ўсю гісторыю аб'яднання.



Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС агучыць прапановы беларускага боку па далейшым развіцці шматпланавага супрацоўніцтва ўнутры «шанхайскай сям'і», акрэсліць ключавыя пытанні, якія патрабуюць узмоцненай увагі.

Як чакаецца, сярод найбольш важных дакументаў кіраўнікі дзяржаў прымуць Цяньцзіньскую дэкларацыю і зацвердзяць стратэгію развіцця ШАС на наступныя 10 гадоў — да 2035 года. Акрамя таго, плануецца разгледзець шэраг іншых пытанняў у сферы бяспекі, эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, прыняць адпаведныя рашэнні, сумесныя заявы і падпісаць міждзяржаўныя пагадненні.

Прэзідэнт Беларусі таксама возьме ўдзел у саміце ў фармаце «ШАС плюс». Да ўдзельнікаў пасяджэння далучацца кіраўнікі дзяржаў-назіральнікаў, міжнародных арганізацый, высокія госці, запрошаныя кітайскім бокам, які старшынствуе. Усяго — больш за тры дзясяткі кіраўнікоў дзяржаў і кіраўнікоў міжнародных арганізацый.

Па запрашэнні кіраўніцтва КНР 3 верасня ў Пекіне Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных 80-годдзю Перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэнню Другой сусветнай вайны. Прэзідэнт будзе прысутнічаць на парадзе, які пройдзе на плошчы Цяньаньмэнь.

Дні знаходжання Прэзідэнта Беларусі ў Кітаі таксама будуць напоўнены перагаворамі з калегамі — кіраўнікамі дзяржаў. Асобную ўвагу плануецца ўдзяліць пытанням развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

# «МЫ НІКОЛІ НЕ ЗДРАДЗІМ НАШЫМ

## Падрабязнасці інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі

Размова Аляксандра Лукашэнкі і карэспандэнта кітайскага медыя Цзо Юнь адбылася ў мінулую пятніцу. Інтэрв'ю было арганізавана напярэдадні буйных міжнародных мерапрыемстваў у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, у якіх па запрашэнні Старшыні КНР Сі Цзіньпіна возьме ўдзел і беларускі лідар. 31 жніўня і 1 верасня ўвага ўсяго свету будзе прыкавана да кітайскага Цяньцзіня, дзе пройдзе саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. А 3 верасня на адной з цэнтральных плошчаў Пекіна адбудзецца парад у гонар Перамогі над японскімі мілітарыстамі і заканчэння Другой сусветнай вайны.




Падчас інтэрв'ю журналістка кітайскай медыякарпарацыі цікавілася чаканнямі Аляксандра Лукашэнкі наконт маючага адбыцца візіту ў Кітай. Акрамя таго, размова ішла пра высокі ўзровень адносін Беларусі і Кітая, інтэнсіўнасць візітаў Аляксандра Лукашэнкі ў Паднябесную, даверлівыя сяброўскія адносіны двух лідараў. Сярод тэм, якія абмяркоўваліся, — значэнне для Беларусі членства ў ШАС, агульныя падыходы ў пытанні захавання гістарычнай памяці, двухбаковыя маштабныя праекты. Спытала кітайская журналіст і пра пазіцыю беларускага лідара наконт мірнага ўрэгулявання ўкраінскага канфлікту, перагавораў прэзідэнтаў Расіі і ЗША на Алясцы — гэты фрагмент з паўтарагадзіннай размовы «Звязда» публікавала ў нумары за 23 жніўня. У сённяшнім выпуску прапануем тое, што на пэўны час заставалася па-за эфірам, стужак навін і газетных матэрыялаў.

### «ЛЮБАЯ СУСТРЭЧА З КІРАЎНІКОМ КІТАЯ — ГЭТА СІГНАЛЫ»

**?** ***Першае пытанне карэспандэнта датычылася пачатку супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. Журналіст адзначыла, што за гады прэзідэнцтва Аляксандр Лукашэнка наведваў КНР 15 разоў, у найбліжэйшыя дні адбудзецца 16-ы па ліку візіт. Яна пацікавілася, чым абумоўлена інтэнсіўнасць візітаў у Паднябесную і якія чаканні ў беларускага лідара ад таго, што мае адбыцца.***

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўпершыню наведаў Паднябесную будучы дэпутатам парламента. Пасля вяртання ў Беларусь Аляксандр Лукашэнка прапанаваў парламентарыям больш уважліва прыгледзецца да гэтай краіны і тады агучыў словы, якія потым сталі прарочымі: за Кітаем — будучыня.

«Нам трэба было больш уважліва прыгледзецца да Кітая, але наша апазіцыя празаходняя, нацыяналістычная ў той час (невялікая, меншасць у парламенце), але яны, як заўсёды, былі самымі крыклівымі, узялі верх, крычалі, што Кітай нам непрымальны, шлях гэты нам непрыдатны, — згадаў кіраўнік дзяржавы. — Але, стаўшы Прэзідэнтам, літаральна праз некалькі гадоў, я асноўную ўвагу ўдзяліў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Разумеючы, як развіваецца постсавецкая прастора, наша брацкая Расія, Украіна, я зрабіў адпаведныя высновы, звярнуўшы ўвагу на Кітай. Сёння пераконваюся, што меў рацыю».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: Кітай быў добрым сябрам Савецкаму Саюзу. «Многае вы ў той час паўтаралі, што было ў нас, але мы з поспехам гэта ўсё, што вам прапаноўвалі, знішчылі, развалілі, а вы з поспехам гэта прыстасавалі для Кітая, прыўнеслі шмат свайго і стварылі той магутны Кітай, які мы назіраем сёння», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка вельмі ўдзячны Кітаю, што яго кіраўніцтва, народ вельмі адкрыта пайшлі на супрацоўніцтва з Беларуссю. «Кітай — вельмі спакойная краіна, нікуды не спяшаецца — сапраўдная цывілізацыя, — патлумачыў свой тэзіс кіраўнік дзяржавы. — Я як гісторык гэта добра разумеў і разумею: калісьці вывучаў Кітай. Яны ніколі нікуды не спяшаліся, яны рабілі ўсё спакойна і грунтоўна — ёсць чаму павучыцца. Таму мы гэта ўлічваем. Мы, еўрапейцы, усё хочам хутчэй-хутчэй. І я апошнім часам заўважыў, што Кітай пачынае паскарацца, бо адчувае, што лавінападобна развіваюцца міжнародныя адносіны. Таму трэба спяшацца: не проста ісці, а бегчы. І я імкнуся бегчы — вось 16 разоў «збегаў» у Кітай і назад».

Па словах Прэзідэнта, кожны яго візіт у КНР заўсёды даваў вельмі добрыя вынікі. «Любая сустрэча з кіраўніком Кітая — гэта сігналы, — акцэнтаваў увагу ён. — Сігналы для нашага грамадства, для вашага грамадства і ў міжнародных адносінах».

### «КІТАЙ ПЕРАЎТВАРЫЎСЯ Ў ІМПЕРЫЮ, БЕЗ ЯКОЙ НЕМАГЧЫМА ВЫРАШЫЦЬ НІ АДНАГА ГЛАБАЛЬНАГА ПЫТАННЯ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ»

**?** ***Журналіст канстатавала, што ў верасні 2022 года беларуска-кітайскія адносіны былі ўзняты на новы ўзровень — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Яна працытавала Старшыню КНР, які сказаў, што «кітайска-беларускія адносіны моцныя і непарушныя». Таксама Цзо Юнь нагадала тэзіс Аляксандра Лукашэнкі: «Будзе моцным Кітай — будзе моцнай і Беларусь». Яна пацікавілася лейтматывам такой ацэнкі развіцця беларуска-кітайскіх адносін і ўдакладніла, што з'яўляецца апорай для пастаяннага руху наперад і дасягнення гістарычнага прарыву ў двухбаковым супрацоўніцтве.***

Прэзідэнт выказаў удзячнасць, што ў сваім пытанні журналіст ахарактарызавала двухбаковыя адносіны. Ен пагадзіўся: супрацоўніцтва Беларусі і Кітая знаходзіцца на самым высокім узроўні.

> **«У Кітаі проста так нічога не бывае: калі яны гавораць аб усепагодным, усебаковым супрацоўніцтве, што гэта на стагоддзі, — значыць, гэта на стагоддзі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Я гэта разумею як ніхто іншы. Рызыкну заявіць, што ніхто ў свеце так не разумее і не адчувае Кітай, паколькі я вельмі сур'ёзна ставіўся да супрацоўніцтва з Кітаем і ўсё-такі 30 з лішнім гадоў ведаю Кітай. Таму зыходжу з перакананне: Кітай не робіць ніякіх заяў проста так, а тым больш не падпісвае пэўныя дакументы, якія можна забыць з цягам часу або не выконваць. Наша пагадненне аб усепагодным і ўсебаковым супрацоўніцтве — гэта вельмі сур'ёзна для нас».**

Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў: перш за ўсё беларуска-кітайскае супрацоўніцтва ўвасабляецца ў эканоміцы. «Што датычыцца палітыкі, дай бог, каб наша эканоміка, нашы адносіны эканамічныя, фінансавыя дараслі да ўзроўню палітычных, — сказаў беларускі лідар. — У нас няма ніякіх праблем, ніякіх рознагалоссяў. Калі трэба ўзгадніць пэўнае пытанне, прыняць сумеснае рашэнне, падтрымаць адзін аднаго, дастаткова аднаго званка з Пекіна ў Мінск або наадварот — і мы аб усім дамовімся на працягу некалькіх хвілін. Гэта сведчыць пра многае. Таму мы за гэты час здзейснілі сур'ёзны прарыў».

# АДНОСІНАМ І НАШАМУ СЯБРОЎСТВУ»

## Медыякарпарацыі Кітая (China Media Group)

Прэзідэнт даў тлумачэнне агучанаму раней тэзісу «Моцны Кітай — моцная Беларусь». «Расійская Федэрацыя і Кітай — гэта самыя-самыя прасунутыя дзяржавы ў адносінах з Беларуссю, — канкрэтызаваў ён. — Мы ад Кітая атрымліваем вялізныя інвестыцыі, нас Кітай гуманітарна вельмі сур'ёзна падтрымлівае. Нашы людзі вельмі на гэта рэагуюць. Вазьміце будаўніцтва спартыўных аб'ектаў: і басейн, і стадыён нацыянальны. Гэта проста падарункі беларускаму народу. Гэта таксама пра многае сведчыць. Кітай проста так нічога не робіць і проста так нікому нічога не дорыць».

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў, што вельмі часта апошнім часам у перагаворах (у прыватнасці з амерыканцамі, якія ўзнімалі гэта пытанне) закранаў тэму беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. «Я па-народнаму вельмі проста гавару: «Калі вы зачынілі дзверы перад намі, у Кітаі нам заўсёды былі адчынены дзверы і ніхто іх не зачыняў, — агучыў дэталі беларускі лідар. — Таму мы з Кітаем супрацоўнічаем і будзем супрацоўнічаць. Мы ніколі не здрадзім нашым адносінам і нашаму сяброўству з кітайскім народам, кітайскай дзяржавай, майму сябру Сі Цзіньпіну. Мы ніколі не былі здраднікамі. Мы ўмеем цаніць тую вялікую дабрыню, якую вы нам аказалі апошнім часам. Нам было б вельмі складана ў гэты санкцыйны перыяд, калі калектыўны Захад абваліў на нас людаедскія санкцыі, калі б у нас не было Расіі і Кітая».

Па словах кіраўніка дзяржавы, раней беларусаў бянтэжыла адлегласць: каб даляцець да Кітая на самалёце, трэба 8-9 гадзін, а ў паўднёвыя правінцыі, з якімі мы супрацоўнічаем, — яшчэ больш. «Цяпер гэта ўжо звыкла для нас, таму мы з вамі ў складаныя часы, у звычайныя часы супрацоўнічалі і будзем супрацоўнічаць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І ў перагаворах з тымі ж амерыканцамі я іх імкнуся пераканаць, што Кітай сёння нельга паставіць на калені, Кітай нельга сёння нахіліць — гэта ўжо не той Кітай».

Прэзідэнт прывёў прыклад Амерыкі. «Нядаўна Дональд Трамп аб'явіў аб павышэнні пошлін на кітайскія тавары, а потым вымушаны быў адступіць, сёння гаворыць: «90 дзён, дамовімся і гэтак далей», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Чаму? Бо такая магутная імперыя, якой з'яўляюцца Злучаныя Штаты Амерыкі, не можа абысціся без Кітая, без кітайскіх тавараў. Вы ўжо заваявалі значную частку рынку Злучаных Штатаў Амерыкі. Вашы тавары вельмі якасныя і па цане больш даступныя для амерыканскіх багатых людзей».

Па словах беларускага лідара, амерыканцам патрэбна з Кітаем дамаўляцца. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Дональд Трамп, як паказалі апошнія падзеі, разумны чалавек, зверне на гэта ўвагу і будзе дамаўляцца з Кітаем.

> **«Кітай пераўтварыўся ў імперыю, без якой немагчыма вырашыць ні аднаго глабальнага пытання ў сучасным свеце, — заявіў Прэзідэнт. — Таму, калі вы будзеце моцныя, і мы будзем мацнейшымі, паколькі ў нас цесныя адносіны. Усё проста: ваша моц — гэта наша моц. І наадварот».**

### «ДА КІТАЯ ТРЭБА НЕ ПРОСТА ПРЫГЛЯДАЦЦА, ТРЭБА НЕКАТОРЫЯ РЭЧЫ БРАЦЬ І ПЕРАНОСІЦЬ У СВАЮ РЭАЛЬНАСЦЬ»

**?** ***Карэспандэнт удакладніла ў Прэзідэнта, адкуль у яго падчас першага візіту ў Паднябесную ўзялася такая ўпэўненасць у Кітаі і якія аспекты кітайскага развіцця, асабліва аспекты мадэрнізацыі, натхнілі беларускага лідара ў кіраванні краінай.***

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь вучыцца ў Кітая па ўсіх пытаннях і кірунках. «Гэта не проста даніна павагі вам і тым, хто мяне пачуе, — удакладніў ён. — Я перакананы чалавек, што да Кітая трэба не проста прыглядацца, трэба некаторыя рэчы браць і пераносіць у сваю рэальнасць. Вядома, з улікам нашых асаблівасцяў, менталітэту, культуры і гэтак далей. Я гэта бачыў даўно, бачу гэта і цяпер. У эканоміцы па парытэце пакупніцкай здольнасці вы ўжо, напэўна, пераўзыходзіце Злучаныя Штаты Амерыкі. Усё, што ўмеюць у свеце рабіць, вы робіце, пры тым робіце вельмі моцна».

Прэзідэнт расказаў, якія рэчы яго ў свой час уразілі ў Кітаі. Па-першае, гэта найноўшыя ўзоры тэхнікі, якія ён убачыў на парадзе. «Гэта цудоўна было, — падзяліўся эмоцыямі кіраўнік дзяржавы. — І я зрабіў для сябе выснову, назіраючы за гэтымі працэсамі: у вас ёсць усё, каб абараніць Кітай. Па-другое, у вас ёсць рашучасць абараняць сваю зямлю. Гэта проста страшныя патрыёты. Я амерыканцам аб гэтым гавару. Ні мы, ні амерыканцы побач у гэтым плане з вамі не стаялі. Вы настолькі рашучыя, што любы праціўнік, перш чым развязаць супраць вас нейкую вайну, тысячу раз падумае, ці варта гэта рабіць».

У свой час Прэзідэнта таксама ўразіла працавітасць кітайскага народа. Падчас аднаго з візітаў у Паднябесную беларускі лідар папрасіў арганізаваць яму паездку ў кітайскую вёску, каб паглядзець, як жывуць людзі там. «Гэта абсалютна быў іншы ўзровень, чым цяпер, — узгадаў кіраўнік дзяржавы. — Яны насілі цэглу: па 5-6 цаглін спераду і ззаду. Звычайна 4 кілаграмы, сырая цэгла — 5 (кілаграм. — **«Зв.»**) будзе важыць. Палічыце. І яны цягалі гэту цэглу з раніцы да вечара. Я на іх паглядзеў, таксама вясковы чалавек, які прызвычаіўся да фізічнай працы, зрабіў для сябе выснову, што гэта сапраўдны народ, які пабудуе Кітай».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што цяпер у Мінску будуецца новы Нацыянальны гістарычны музей, яго экспазіцыя будзе ствараюцца па кітайскім прынцыпе. Па кітайскім вопыце, адзначыў Прэзідэнт, ажыццяўляецца і добраўпарадкаванне нашых сталічных праспектаў і вуліц. «Таму, пачынаючы ад добраўпарадкавання (у асноўным, у Пекіне я бачу гэта) і заканчваючы эканомікай па самых сур'ёзных кірунках (IT-тэхналогіі, штучны інтэлект і гэтак далей), мы глядзім, як вы развіваецеся, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І патрэбнае для нас мы адтуль бяром. Вось так, пакрысе, кропкава, а часам і павальна, мы пераймаем у вас ваш вопыт. Вы як сапраўдныя сябры не шкадуеце гэтага».

### «ГЭТА ВЕЛЬМІ МОЦНЫ КІРАЎНІК КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ»

**?** ***Карэспандэнт заўважыла, што Прэзідэнта Беларусі і Старшыню КНР звязвае вельмі моцнае сяброўства. Цзо Юнь пацікавілася ў Аляксандра Лукашэнкі, якім лідарам ён бачыць Сі Цзіньпіна і якое стратэгічнае значэнне для развіцця беларуска-кітайскіх адносін мае дыпламатыя лідараў.***

Прэзідэнт ахарактарызаваў іх узаемаадносіны з кітайскім калегам як вызначальныя. «І гэта заснавана на тых ролях, якія іграюць Прэзідэнт Беларусі і Старшыня КНР, — звярнуў ён увагу. — Што тут утойваць, гэта людзі, якія па Канстытуцыі валодаюць вельмі высокай уладай. Уся паўната ўлады засяроджана ў вас і ў нас у руках першых асоб. Таму ад таго, якія ў нас адносіны, якія мы прымаем рашэнні, у многім будзе залежаць развіццё краіны. Таму для нас вельмі важна, якія ў нас будуць адносіны. Адносіны ў нас добрыя».

Па словах беларускага лідара, Старшыня КНР валодае ўсімі неабходнымі якасцямі. «Гэта вельмі моцны кіраўнік Кітайскай Народнай Рэспублікі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І дзякуючы яму ў апошні час Кітай зрабіў такі рывок у сваім развіцці».

Прэзідэнту падабаецца, што яго кітайскі калега праце па-сур'ёзнаму, па вялікіх глабальных пытаннях. «Ёсць чаму павучыцца, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Добры ў вас кіраўнік. Не таму, што ён мой сябар. Ён моцны кіраўнік, якога паважаюць у свеце. Яго вельмі паважаюць. А раз паважаюць кіраўніка — значыць паважаюць і дзяржаву».

### «БЕЗ КРАІН ШАС НЕ МОЖА СЁННЯ БЫЦЬ ВЫРАШАНА НІ АДНО З ПЫТАННЯЎ»

**?** ***Адказваючы на пытанне, што азначае для Беларусі ўступленне ў ШАС і якія чаканні ад маючага адбыцца саміту, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што членства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва з'яўляецца вельмі важным для нашай краіны.***

«Для нас вельмі важна быць у гэтай сям'і, — падкрэсліў Прэзідэнт. — На пасяджэнні ШАС будзе прысутнічаць звыш 20 кіраўнікоў дзяржаў, вядучых дзяржаў у свеце. Быць у гэтай сям'і не проста пачэсна. Гэта натхняе любы народ, у тым ліку і беларускі, што іх Прэзідэнт знаходзіцца ў гэтай салідной сям'і, якая сёння, давайце шчыра казаць, у многім вызначае развіццё нашай планеты. Я нават так сказаў бы: з аднаго боку — Еўрапейскі саюз і лідар — Злучаныя Штаты Амерыкі, на Захадзе, і тут — Кітай, Індыя, Расія (тры наймагутнейшыя дзяржавы), і вакол гэтага ядра сабраліся вельмі развітыя, прасунутыя краіны, тэхналагічна».

Самае важнае, па словах кіраўніка дзяржавы, што ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ёсць усё. «У нас дастаткова тэхналогій, у нас звышдастаткова працоўнай сілы, людзей (1,5 мільярда ў Індыі, блізка да 1,5 мільярда ў Кітаі, Пакістан — 250 мільёнаў чалавек і гэтак далей), — канкрэтызаваў ён. — У нас ёсць моцныя валюты (юань, на які сёння вельмі арыентуюцца многія краіны, і мы ў тым ліку, рупія, расійскі рубель. Гэта моцныя валюты, таму і ў фінансавых адносінах мы маем пэўную моц. Эканамічна, палітычна — без краін ШАС не можа сёння быць вырашана ні адно з пытанняў. Вымушаны лічыцца моцныя свету з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва».

Аляксандр Лукашэнка памятае, як вяліся перагаворы наконт членства Беларусі ў ШАС. «Усё было не проста, — канстатаваў ён. — Глядзяць на баланс сіл. Кітай, Расія — адзін на аднаго глядзяць. Індыя глядзіць на Кітай. Добра, што ў вас цяпер пацяплелі адносіны, дзякуючы ў тым ліку Злучаным Штатам Амерыкі. Мы гэта вітаем, мы рады, што вы зрабілі крок насустрач індусам, а яны насустрач вам. Гэта саюз, які ўжо нікому не ўдасца пераадолець, перабіць. Таму цэнтр цяжару сёння ціха, спакойна змяшчаецца ў бок Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. І мы — там. Гэта дрэнна або добра? Элементарна адказваю на ваша пытанне: гэта вельмі добра».

Па словах Прэзідэнта, каля 85 % беларускага экспарту ідзе ў краіны ШАС. «Амаль усё, — падкрэсліў ён. — Дык што ў гэтым дрэннага? Гэта здорава».



Аляксандр Лукашэнка атрымаў запрашэнне на перагаворы з Сі Цзіньпінам, якія запланаваны ў бліжэйшы час. «Ён прапанаваў сустрэцца, калі ёсць пэўныя складаныя пытанні, іх абмеркаваць, — удакладніў беларускі лідар. — І не толькі з Кітаем. Я магу з індусамі сустрэцца перагаварыць, я магу сустрэцца з расіянамі, хоць тут праблем няма, з іншымі членамі ШАС. Мы адна сям'я, мы абмяркоўваем праблемы і выпрацоўваем перспектывы. Гэта для нас добра. Для нас, параўноўваць нас з дзесяцi 10-мільённым насельніцтвам з 1,5 мільярда (насельніцтва. — **«Зв.»**) Кітая або Індыі, іншымі краінамі. Гэта вельмі пачэсна. І не толькі пачэсна, але вельмі карысна для нашай эканомікі. І для прамысловасці асабліва. Калі ўявлі санкцыі, мы ў Кітаі атрымліваем усё тое, што мы набывалі раней на Захадзе. І рухавікі, і гідраўліку, і камплектуючыя для нашых аўтамабіляў (наша краіна машынабудаўнічая), і гэта высокай якасці».

Як прыклад узаемавыгаднага супрацоўніцтва кіраўнік дзяржавы прывёў Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», які Старшыня КНР назваў жамчужынай «Аднаго пояса — аднаго шляху» (Сі Цзіньпін удзельнічаў у яго адкрыцці). «Туды спрабуем зацягнуць самыя перадавыя кітайскія тэхналогіі, — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гэта робім. Кітаю гэта выгадна, нам тым больш. Вось вам адказ на пытанне, што нам дае Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва».

*(Працяг на 4-й стар.)*

# «МЫ НІКОЛІ НЕ ЗДРАДЗІМ НАШЫМ АДНОСІНАМ І НАШАМУ СЯБРОЎСТВУ»



Па словах беларускага лідара, кітайцы былі ініцыятарамі стварэння ШАС. Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва развіваецца грунтоўна, спакойна і ўпэўнена. На думку Прэзідэнта, патрэбна больш імклівa. «На адным з пасяджэнняў я папракнуў калег, што мы занадта павольна дзейнічаем, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Можа, ужо даўно трэба было стварыць сваю валюту для міжнародных разлікаў. Магчыма, гэта будзе і юань, магчыма, нейкая іншая агульная валюта. Пакуль нас не стукнуць добра па галаве, мы не можам рухацца. Упэўнены, што мяне пачулі».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь — не глабальная краіна, ніхто тут не пакутуе глабалізмам. «Нам дастаткова па-кітайску — пакрысе, і мы будзем мець добрае развіццё», — лічыць Прэзідэнт.

## «ПРОПУСК АДЗІН — ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ»

? ***Карэспандэнт падкрэсліла, што індустрыяльны парк «Вялікі камень» стаў узорам эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Журналісты пабывалі ў парку, дзе ўбачылі падпісаныя беларускім лідарам пяць указаў, якія ствараюць льготныя ўмовы для функцыянавання рэзідэнтаў парка. Цзо Юнь пацікавілася, ці будуць новыя крокі па далейшым павышэнні прывабнасці парка і прыцягненні большай колькасці прадпрыемстваў з Кітая, Беларусі, іншых краін.***

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, ствараючы гэты парк, бачыў у ім самыя передавыя тэхналогіі. «Было жаданне зрабіць тут нейкія склады і завозіць кітайскую прадукцыю ў гэтыя склады, перагружаць у Еўропу і наадварот, — канстатаваў ён. — Хаця я разумеў, што кітайцам нельга рабіць жорсткія прапановы і заўвагі, я Сі Цзіньпіну рызыкнуў сказаць, што не супраць таго, каб тут былі тавары, якія перагружаліся б на чыгунку, на аўтамабільны транспарт і ішлі б туды, да Ла-Манша, у Еўропу, але там павінны працаваць прадпрыемствы высокіх тэхналогій. І Сі мяне падтрымаў. Цяпер парк — гэта збор прадпрыемстваў з высокімі тэхналогіямі, інвестыцыямі ўжо пад 2 мільярды долараў. Гэта вялікія інвестыцыі. Таму «Вялікі камень» — гэта передавыя тэхналогіі».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што «Вялікі камень» — не толькі кітайскія тэхналогіі. Сёння там прадстаўлены 15 краін, якія інвесціруюць у эканоміку Беларусі. «Калі ласка, прыходзьце, але пропуск адзін — высокія тэхналогіі, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — У іншым выпадку той ільготны рэжым, які там створаны, мог бы перацягнуць туды ўсе нашы прадпрыемствы, беларускія, расійскія, і месца не хапіла б. Інвесціруйце, стварайце, развівайце — вось вам ільготны рэжым».

Па словах беларускага лідара, кітайцы вельмі шмат інвесціруюць у парк. Яны фінансавалі і фінансуюць будаўніцтва некаторых аб'ектаў, у тым ліку будуюць жыллё для тых людзей, якія там працуюць.

«Мы стварылі з Сі Цзіньпінам добрае месца для вашага руху па «Поясе і шляху» ў Еўропу і назад, для супрацоўніцтва з Беларуссю, Расіяй, — рэзюмаваў Прэзідэнт. — Гэта добры шлях для развіцця Кітая. І нам вельмі карысна».

## «КАЛІ МЫ ПАМЯТАЕМ, ТО ГЭТА НЕ ПАЎТОРЫЦЦА»

? ***Адказваючы на пытанне, якія чаканні ад кітайскага парада ў гонар Перамогі над японскімі мілітарыстамі і заканчэння Другой сусветнай вайны, Аляксандр Лукашэнка, які прысутнічаў на падобным мерапрыемстве ў Кітаі 10 гадоў таму, падзяліўся, што з вялікай цікавасцю хацеў бы паглядзець на тое, што будзе прадэманстравана Кітаем і яго народам на парадзе.***

«Я хачу праз 10 гадоў убачыць, чаго вы дасягнулі ў ваенных адносінах, абараназдольнасці Кітая і параўнаць з тым, што было 10 гадоў таму, — падзяліўся Прэзідэнт. — Тады было вельмі моцна, вельмі магутна. Сама арганізацыя. Вы паказалі самую передавую зброю. Думаю, што нашы чаканні Сі Цзіньпін задаволіць і не падвядзе нас. Ён пакажа ўсё самае передавое, што вы маеце сёння ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы».

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць кітайскаму народу за тое, што яны заўсёды адпраўляюць сваіх ваеннаслужачых у Беларусь для ўдзелу ў парадзе з нагоды Дня Незалежнасці нашай краіны або юбілею Вялікай Перамогі. Асобныя словы падзякі прагучалі за запрашэнне беларускай дэлегацыі для ўдзелу ў маючым адбыцца парадзе ў Пекіне.

? ***Журналіст адзначыла, што ў Беларусі і Кітая падобны вопыт барацьбы ў Другой сусветнай вайне, і пацікавілася ў Прэзідэнта, якое значэнне для сучаснага свету мае захаванне гістарычнай памяці.***

«Мы і вы страцілі вялікую колькасць людзей, — кажучы аб тых падзеях, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — На алтар Перамогі мы паклалі 30 мільёнаў чалавек. Столькі ж загінула кітайскіх людзей у гэты страшны час. Японскія мілітарысты забівалі ўсіх, каго маглі. Знішчалі проста народ. І калі мы памятаем, то гэта не паўторыцца. Дакладна не паўторыцца. Забудзем — гэта прыйдзе зноў да нас. Таму мы разам з кітайскім народам, вашай дзяржавай свята захоўваем тую памяць аб нашай Перамозе».

Прэзідэнт падкрэсліў, што калі б мы прайгралі, то абсалютна па іншых крытэрыях развівалiся б сёння нашы краіны. «Мы захавалі мір, гэтым самым захавалі магчымасць і вам, і нам, і іншым краінам жыць па сваіх законах і развівацца настолькі, наколькі гэтыя краіны здольныя», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

## «Я НЕ ПАВІНЕН ПАДВЕСЦІ МОЙ НАРОД»

? ***Карэспандэнт звярнула ўвагу на тое, што Аляксандр Лукашэнка за гады свайго прэзідэнцтва ніколі не праводзіў у Беларусі «шокавую тэрапію», а выбраў паступальны шлях развіцця. Яна ўдакладніла, якімі прынцыпамі беларускі лідар кіруецца ў прыняцці рашэнняў, якой краінай хоча бачыць Беларусь.***

«Наша краіна павінна развівацца ціха, спакойна, без усялякіх рыўкоў, без рэвалюцый, як я казаў, эвалюцыйна, — я гэтага хачу, — адзначыў беларускі лідар. — Я хачу, каб новы Прэзідэнт, які прыйдзе пасля мяне, нічога не ламаў. Спакойна, па-кітайску, вытрымана ацаніў усё і павёў сваю краіну, беларускае грамадства туды, куды трэба».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у свеце няма больш такой краіны, якая б знаходзілася ў такім складаным становішчы, як Беларусь. У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка прывёў словы Дональда Трампа, сказаныя ім падчас размовы з яго беларускім калегам. «Ён мне сказаў такую фразу: «Я табе жадаю поспехаў, твая краіна знаходзіцца ў такім складаным месцы і ў такі складаны перыяд, што справіцца з гэтым можа толькі моцны лідар», — расказаў Прэзідэнт. — Напэўна, калі ён вывучаў сітуацыю, пазнаёміўся з Беларуссю, бачыў, што ў нас няпроста: і на ўсходзе, і на захадзе, і на поўдні... І на поўначы хапае нашых гэтых балтыйскіх суседзяў адурэлых. Ён пагадзіўся з гэтым і сказаў аб тым, што ў вельмі складанай сітуацыі знаходзіцца Беларусь. Пажадаў нам поспехаў».

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў кітайскага карэспандэнта, што пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь была самай савецкай рэспублікай. «Яна была самай адданай рэспублікай у складзе Савецкага Саюза, адданай нашаму саюзу, — падкрэсліў ён. — Нідзе такога народа не было, як наш. Наш народ інтэрнацыянальны, ён прывык жыць у сяброўстве, згодзе. Гэта кітайцы могуць самі па сабе існаваць, ім ніхто не патрэбны. А мы прызвычаіліся жыць калектыўна».

Пасля распаду Савецкага Саюза, як канстатаваў кіраўнік дзяржавы, беларуская эканоміка апынулася ў складаным становішчы. «У сілу таго, што кааперацыйныя сувязі былі вельмі шырокія, — патлумачыў Прэзідэнт. — Адкуль мы толькі ні атрымлівалі (і з Расіі, і з Казахстана, і з Украіны, і з Прыбалтыкі) камплектуючыя, запчасткі, рэсурсы і іншае. І тут мы стварылі канчатковы прадукт для продажу ўнутры Савецкага Саюза, за межамі Савецкага Саюза. Дарэчы, гэтым тлумачыцца высокі ўзровень інтэлектуальнага, адукацыйнага развіцця нашага народа».

У Беларусі стварaўся канчатковы прадукт: трактары, аўтамабілі, сельскагаспадарчая тэхніка, прадукцыя хіміі, нафтахіміі, адзенне, абутак і іншае. «Тавар, сыравіна ішлі з Усходу на Захад (на Захадзе не прадасі дрэннае), нешта мы прадавалі на Захадзе, але гэта было самае лепшае, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — І мы сваімі рукамі гэта стварaлі. Часткова ў Прыбалтыцы гэта рабілі, нешта ва Украіне (Украіна вельмі шмат працавала на ўнутраныя патрэбы, абаронны сектар быў вялікі, тыя ж ракеты рабілі), а мы ўсё-такі выраблялі тавары народнага спажывання і машынабудаўнічую прадукцыю і прадавалі гэта на Захадзе».

Па словах Прэзідэнта, для Беларусі распад СССР быў вельмі балючым. «Нам трэба было гэта ўсё захаваць — адсюль наша палітыка, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Нацыяналісты нашы крычалі, якія прывялі Украіну да вайны, дарэчы, «ды нам не патрэбен Кітай, нам не патрэбна Расія, патрэбен свой шлях, а калі што, то з палякамі або з амерыканцамі». Калі б мы тады паступілі не па-кітайску (рванулі б на Захад), мы б краіны не мелі. Яна проста развалілася б, у нас не было б эканомікі. І ў нас, як у некаторых постсавецкіх рэспубліках, перманентна былі б гэтыя «каляровыя» рэвалюцыі. Гэта быў бы падарунак Захаду. Але мы па-кітайску паступілі: супакоіўшыся, зразумелі — тое, што ёсць, кідаць не трэба. Трэба гэта развіваць, удасканальваць, мадэрнізаваць».

Было разуменне, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, што не трэба страчваць сяброў, якія пастаўлялі нам сыравіну і рэсурсы, а таксама не варта страчваць нашы рынкі, дзе мы прадавалі гэту прадукцыю. «Таму сказаць, што я тады, калі мне яшчэ і 40 не было, гэта ўсё разумеў, не скажаш, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Напэўна, Гасподзь дапамог. Я часта кажу пра гэта, хоць мае калегі мне кажуць і тыя, хто побач працуе, не гаварыць гэта — што я выпадковы Прэзідэнт. Гэта сапраўды. Я пачынаю ўспамінаць, што было, усё гэта ацэньваць і думаю, як народ рызыкнуў мяне, увогуле нявопытнага чалавека, у той час выбраць Прэзідэнтам. Я гэта, вядома, цаню. І для мяне гэта галоўны стымул у рабоце.

**Я не павінен падвесці тых, хто са мной побач сёння, і мой народ. Вось гэта пачуццё адказнасці, напэўна, павінна быць у кожнага Прэзідэнта, але ў мяне яно асаблівае, бо народ рызыкнуў, выбраў мяне, я павінен гэтаму народу вельмі многае. Напэўна, яшчэ ўсё і не аддаў, што яму павінен. Буду, пакуль жывы, гэта рабіць.**

Акрамя таго, па словах кіраўніка дзяржавы, прымаць важныя рашэнні ў пачатку прэзідэнцтва беларускаму лідару дапамагаў вопыт калег. «Вучыўся ў іншых прэзідэнтаў: тое, што патрэбна было, убіраў у сябе і спрабаваў рэалізоўваць у нашай краіне, — канкрэтызаваў ён. — Трэба любіць сваіх людзей, свой народ. Іх нельга падвесці. Калі ў цябе будзе гэтая адказнасць, адказнасць кіраўніка, тады табе і Гасподзь дапаможа. Калі ты будзеш зладзюгам і ты прыйшоў для таго, каб стварыць свой дабрабыт і сваіх прыбліжаных, родных, блізкіх, тады ў цябе нічога не атрымаецца і Бог табе не дапаможа. Ён, напэўна, усё-такі мне дапамог».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# «ПА КОЛЬКАСЦІ ПАГАДНЕННЯЎ, КАНТРАКТАЎ І ІХ СУМЕ МЫ ПЕРАВЫСІМ УЗРОВЕНЬ 2024 ГОДА»

## Савет Рэспублікі — аб III Беларуска-ўзбекскім жаночым бізнес-форуме, які пройдзе ў Віцебску

Ужо зусім хутка — 2-3 верасня — Віцебск стане месцам бізнес-прыцягнення. Менавіта тут пройдзе трэці беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум. Сёлета тэма форуму — «Беларусь — Узбекістан: супрацоўніцтва як фактар устойлівага развіцця» — як ніколі актуальная і адлюстроўвае стратэгічны курс нашых краін на паглыбленне двухбаковага партнёрства і інтэграцыю ў рэгіянальныя рынкі. Пра тое, чаго чакаць ад гэтай падзеі, пагаварылі са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіславам ТАТАРЫНОВІЧАМ.



Трэба сказаць, што Беларусь і Узбекістан дэманструюць устойлівую дынаміку росту ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах — ад эканомікі і культуры да аховы здароўя і адукацыі. За апошнія гады нашы краіны не толькі ўмацавалі традыцыйныя сувязі, але і адкрылі новыя гарызонты супрацоўніцтва, у тым ліку ў рамках парламенцкай дыпламатыі і сумесных праектаў, што рэалізуюцца на аснове ўзаемадапаўняльнасці эканомік. Што тычыцца беларуска-ўзбекскіх жаночых бізнес-форумаў, якія сталі ўжо традыцыйнымі, яны ўжо даказалі сваю эфектыўнасць як ключавыя пляцоўкі для запуску канкрэтных ініцыятыў.

Так, у рамках першага форуму было падпісана 15 кантрактаў на агульную суму 29 мільёнаў долараў. Другі форум прынёс больш важкі вынік — 18 кантрактаў на суму 44 мільёны долараў. Чакаецца, што трэці форум стане новым крокам у нарошчванні аб'ёмаў супрацоўніцтва і пашырэнні геаграфіі праектаў.




На думку суразмоўцы, паспяховае правядзенне папярэдніх мерапрыемстваў, насычаны парадак дня, добрая выніковасць вызначае вельмі высокі ўзровень зацікаўленасці ва ўдзеле ў мерапрыемствах трэцяга беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму з боку органаў дзяржкіравання, прадпрыемстваў, арганізацый, бізнесу з абодвух бакоў.

**— На сённяшні момант толькі з боку партнёраў (з улікам афіцыйнай дэлегацыі Сената Олій Мажліса Узбекістана, органаў дзяржаўнага кіравання Узбекістана і прадстаўнікоў бізнес-супольнасці) чакаецца каля 150 чалавек. Агульная колькасць удзельнікаў форуму — каля 350 чалавек, — паведаміў Уладзіслаў Татарыновіч.**

### УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

На яго думку, выбраны фармат форуму, які быў апрабаваны арганізатарамі ў папярэднія гады (гэта работа ў тэматычных секцыях, падвядзенне вынікаў у рамках пленарнага пасяджэння пад старшынствам кіраўнікоў верхніх палат парламентаў, абмеркаванне пытанняў двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў рамках Савета дзелавых колаў) вызначаюць сур'ёзную цікавасць да правядзення трэцяга Форуму ў Віцебску. Нагадаем, што сёлета тэма гучыць так: «Беларусь—Узбекістан: супрацоўніцтва як фактар устойлівага развіцця».

— Што тычыцца канкрэтных дамоўленасцяў, камерцыйных кантрактаў, пагадненняў, якія будуць прымаць удзельнікі, яны могуць насіць рамачны характар у выглядзе дарожных карт, намераў аб супрацоўніцтве, так і ў выглядзе канкрэтных пагадненняў. Прыемна, што на гэты раз пагадненні будуць заключаць не толькі вобласці, але і нашы гарады і раёны з адпаведнымі хакіматамі Рэспублікі Узбекістан, — праанансаваў старшыня профільнай камісіі.

Суразмоўца дадаў, што работа актыўна праводзіцца па ўсіх кірунках.

**— Таму я з упэўненасцю магу сказаць, што па колькасці пагадненняў, кантрактаў і іх суме мы перавысім узровень 2024 года, — запэўніў Уладзіслаў Татарыновіч.**

— Актыўна праца вядзецца нават цяпер, напярэдадні пачатку асноўных мерапрыемстваў форуму.

### З ПАЗНАКАЙ «УПЕРШЫНЮ»

Што тычыцца навацый, суразмоўца анансаваў большую колькасць тэматычных секцый, чым у ранейшыя гады.

— Калі мы гаворым пра тое, што форум садзейнічае не толькі развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, але і па напрамках, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Напрыклад, у асобную секцыю выдзелена супрацоўніцтва моладзі дзвюх краін (секцыя № 6. — **Заўв.аўт.**). У выглядзе асобнай секцыі (№ 7. — **Заўв. аўт.**) мы будзем разглядаць пытанні работы органаў мясцовага самакіравання, іх ролю ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, будзем дзяліцца вопытам, абмяркоўваць, як найбольш правільна вырашаць пытанні, што ўзнікаюць у нашых грамадзян, якія пражываюць у нас на тэрыторыі сельскіх саветаў і, адпаведна, кенгашы (саветаў. — **Заўв. аўт.**) ва Узбекістане. Гэта таксама ўяўляе вялікую ўзаемную цікавасць.

Паводле слоў парламентарыя, калі пачалася падрыхтоўка да правядзення трэцяга беларуска-ўзбекскага форуму, гэтая тэма была вельмі цікавая ўзбекскім партнёрам.

Яшчэ адна навацыя, на якой акцэнтаваў увагу старшыня профільнай камісіі — месца правядзення:

— У адрозненне ад папярэдніх форумаў (першы праходзіў у Мінску, другі — у Ташкенце) трэці праходзіць не ў сталіцы, а ў рэгіёне. У Віцебску маюць паспяховы вопыт правядзення мерапрыемстваў падобнага роду. Дастаткова ўзгадаць, што летась у Віцебску (таксама Полацку і Наваполацку) праходзілі мерапрыемствы XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — нагадаў Уладзіслаў Татарыновіч і выказаў упэўненасць, што і ўсе запланаваныя мерапрыемствы пройдуць на высокім арганізацыйным узроўні.

Ён таксама звярнуў увагу на важнасць пытанняў, якія будуць абмяркоўвацца:

— Пачынаючы ад пытанняў эканомікі, сацыяльнага, гуманітарнага характару, наладжвання двухбаковых сувязяў, якія сведчаць аб тым, што ў рэгіянальным разрэзе таксама ёсць зацікаўленасць.

У якасці прыкладу суразмоўца прывёў прадпрыемства «Энергакамплект», якое працуе ў Віцебску і паспяхова супрацоўнічае з Узбекістанам.

Акрамя таго, у плане міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў Віцебскай вобласці на сённяшні момант рэалізуюцца пагадненні з трыма абласцямі Рэспублікі Узбекістан: Джызакскай, Неманганскай і Кашкадар'інскай.

### АКЦЭНТ – НА РАЗВІЦЦЁ

Што тычыцца міжпарламенцкага вектара ўзаемадзеяння, Уладзіслаў Татарыновіч адзначыў:

— Само правядзенне трэцяга беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму дае нам магчымасць яшчэ раз разгледзець пытанні міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, якія знаходзяцца на вельмі высокім узроўні, а таксама павысіць узровень узаемадзеяння паміж парламентамі дзвюх краін праз арганізацыю адпаведных двухбаковых камісій, — адзначыў парламентарый і канкрэтызаваў. — У нас паспяхова рэалізуецца праграма мерапрыемстваў дарожнай карты па супрацоўніцтве паміж Сенатамі Беларусі і Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан на 2024-2025 гады.

Ён дадаў, што па ініцыятыве беларускага боку распрацаваны і плануецца да прыняцця аналагічны план мерапрыемстваў — дарожная карта — ужо на 2026-2027 гады.

## У тэму

Як расказаў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ,** адным з яркіх прыкладаў паспяховага беларуска-ўзбекскага ўзаемадзеяння з'яўляецца супрацоўніцтва паміж Брэсцкай абласной клінічнай бальніцай і Бухарскім абласным медыцынскім цэнтрам.



— У рамках заключанага дагавора праведзены дзве міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі — у Белавежскай пушчы і Бухары. Узбекскія медыкі прайшлі дзесяцідзённую стажыроўку ў Брэсце, а цяпер беларускі спецыяліст — загадчык аддзялення трансплантацыі Андрэй Шасцюк — камандзіраваны ў Бухару на шэсць месяцаў для абмену вопытам, — паведаміў сенатар.

На яго думку, такія праекты не толькі ўмацоўваюць прафесійныя сувязі, але і павышаюць якасць медыцынскіх паслуг у абодвух рэгіёнах.

Суразмоўца адзначыў, што беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум ужо стаў добрай традыцыяй і эфектыўнай пляцоўкай для перамоў, якая спрые ўмацаванню дзелавых і гуманітарных сувязяў паміж нашымі краінамі.

— Упэўнены, што трэці форум адкрые новыя магчымасці для рэалізацыі сумесных праектаў і паглыблення інтэграцыі не толькі ў двухбаковым фармаце, але і ў рамках больш шырокага еўразійскага партнёрства, — падкрэсліў ён.

ЖНІВО-2025

# ЗА КОШТ ЗАХАВАННЯ ТЭХНАЛОГІЙ І АДКАЗНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## У Брэсцкім аблвыканкаме расказалі аб складніках рэкорднага ўраджаю

**Сёлета на Брэстчыне ўпершыню ў гісторыі намалацілі 1,5 млн тон. Усе 16 раёнаў павялічылі вал збожжа ў параўнанні з папярэднім годам, паведаміў першы намеснік Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ.**

Павелічэнне валавога збору да выніку 2024 года склала больш за 187 тыс. тон. Лідарам на ўборачнай кампаніі стаў Баранавіцкі раён, дзе намалацілі больш за 180 тыс. тон збожжа. Упершыню ў вобласці 8 раёнаў — Баранавіцкі, Пружанскі, Камянецкі, Кобрынскі, Пінскі, Драгічынскі, Іванаўскі і Столінскі — перасягнулі мяжу па намалоце ў 100 тыс. тон.

«Ёсць у нас гаспадаркі-лідары. Больш як 50 тыс. тон намалочана на «Птушкафабрыцы «Дружба» Баранавіцкага раёна. Акрамя таго, звыш 30 тыс. тон атрымана ў чатырох гаспадарках — «Белавежскі» (Камянецкі раён), «Крошын» (Баранавіцкі раён), «Ружаны-Агра» (Пружанскі раён), «Астрамечава» (Брэсцкі раён). Звыш 10 тыс. тон сабралі ў 37 гаспадарках», — адзначыў першы намеснік старшыні аблвыканкама.

Сярэдняя ўраджайнасць на палях Брэсцкай вобласці сёлета складае 45,1 ц/га, што на 7,8 ц/га больш за леташнюю. «Напрыклад, Драгічынскі атрымаў плюс 13,5 ц/га, Іванаўскі — плюс 12,3 ц/га, Жабінкаўскі — плюс 11,2 ц/га. Маларыцкі і Пінскі прыбавілі больш за 10 ц/га, а Столінскі — амаль 10 ц/га. Сярэдняя ўраджайнасць звыш 50 ц/га ў трох раёнах — Баранавіцкім, Ляхавіцкім і Столінскім. Хацеў бы адзначыць рэгіёны, якія не маюць асабліва ўрадлівых зямель, але пры гэтым за кошт захавання тэхналогій, адказнасці людзей, высокага ўзроўню арганізацыі работы атрымалі таксама ўраджайнасць амаль 50 ц/га. Лідарамі па ўраджайнасці сярод гаспадарак Брэстчыны сталі «Шлях новы» Ляхавіцкага раёна — 77,4 ц/га, «Крошын» — 76,3 ц/га, УП «Грушава-мілк» Столінскага раёна — 68,6 ц/га.

Першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама падкрэсліў, што рэкорднаму ўраджаю паспрыяла сукупнасць фактараў. І ў першую чаргу тэхналагічны падыход (пачынаючы ад этапу пасяўной, работы з мінеральнымі ўгнаеннямі, абароны збожжавых культур).

У Брэсцкай вобласці 752 экіпажы намалацілі больш за 1 тыс. тон збожжа, 93 — больш за 2 тыс. тон, сем — больш за 3 тыс. тон, адзін — больш за 4 тыс. тон і яшчэ адзін — больш за 5 тыс. тон. У перадавікі выйшаў экіпаж з «Крошына». Ігар Гаўрык і Аляксей Малейка намалацілі больш як 5 тыс. тон збожжа. У гэтай жа гаспадарцы працуе вадзіцелем Вячаслаў Трус, які перавёз амаль 8,9 тыс. тон збожжа.

«Шчырыя словы падзякі кожнаму хлебаробу. Вынік — унёсак розных пакаленняў нашых аграрыяў: і кіраўнікоў, і спецыялістаў, і механізатараў, аграномаў, інжынераў, усіх і кожнага, хто рабіў задзел для атрымання ўраджаю, доглядаў, прыкладаў намаганні для збору ўраджаю з мінімальнымі стратамі», — рэзюмаваў Дзмітрый Гарадзецкі.

**Паводле БелТА.**




РЭГІЁНЫ

# ПРАЦАВАЦЬ З ЭКАНАМІЧНАЙ ДЫСЦЫПЛІНАЙ

## На Гродзеншчыне абмеркавалі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна і выкананне бюджэту за першае паўгоддзе 2025 года

**Як адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ, Гродзенская вобласць дэманструе станоўчыя вынікі ў сферы эканамічнага развіцця. Асноўны пакзчык — валавы рэгіянальны прадукт — склаў 12,6 млрд рублёў. Гэта 100,9 % да ўзроўню аналагічнага перыяду 2024 года. Аднак ёсць і сферы, якія патрабуюць увагі. Гэта развіццё прамысловасці, будаўніцтва і транспартнай інфраструктуры. Гэтыя кірункі патрабуюць кіраўніцкіх намаганняў і каардынацыі паміж рознымі ўзроўнямі ўлады.**

— Спраўляемся ў цэлым добра, але ёсць такое паняцце, як эканамічная дысцыпліна. Паказчыкі павялічваюцца нераўнамерна. Па валавым рэгіянальным прадукце мы крыху не дасягнулі плана. Прычыны тлумачацца аб'ектыўна: сельскагаспадарчыя работы ў рэгіёне пачаліся пазней, чым звычайна, з-за неспрыяльных умоў надвор'я, што прывяло да меншых паказчыкаў ураджайнасці і надояў малака. Аднак мы абавязкова збяром свае тоны, проста крыху пазней, — адзначыў губернатар.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці, аграрны сектар дэманструе добрыя вынікі. Агульны аб'ём выробленай прадукцыі дасягнуў 2,21 мільярда рублёў. У жывёлагадоўлі назіраецца ўпэўнены рост: выраблена 860 900 тон малака, што на 4,6 % вышэй за паказчык мінулага года. Сярэдні надой на адну карову павялічыўся на 137 кг. Па выніках першага паўгоддзя ён склаў 3926 кг. Вытворчасць мяса буйной рагатай жывёлы склала 66 000 тон — 100,6 % да аналагічнага перыяду мінулага года. Вытворчасць птушкі дасягнула 27 000 тон — 106,5 %. У раслінаводстве былі пашыраны пасяўныя плошчы пад цукровыя буракі, рапс, кукурузу і лён.

Прамысловасць рэгіёна таксама мае вялікія перспектывы для росту. Чакаецца, што паказчыкі павялічацца за кошт дыверсіфікацыі і пашырэння продажаў.



grodnonews.by

Агульны аб'ём вытворчасці склаў 11,8 мільярда рублёў, што роўна 11,5 % ад усяго аб'ёму краіны. Прыкметна вырасла вытворчасць прадуктаў харчавання, напояў, драўляных і папяровых вырабаў, а таксама гумавых і пластыкавых тавараў. Рэгіён робіць стаўку не толькі на традыцыйныя прадукты харчавання, але і на шырокі асартымент прадукцыі.

Кіраўнік вобласці таксама адзначыў, што рост заработнай платы — важны паказчык дабрабыту насельніцтва. У рэгіёне назіраецца яе значны рост, яна павялічылася на 18,1 %. Юрый Караеў падкрэсліў важнасць падтрымкі росту заработнай платы, паколькі працоўныя рэсурсы маюць высокую каштоўнасць, і нельга дапускаць іх адток. Аднак, паводле яго слоў, гэта не павінна быць самамэтай, бо неабходна ўлічваць інвестыцыйныя праекты і ствараць высокапрадукцыйныя працоўныя месцы.

У эканоміцы рэгіёна занята каля 435 000 чалавек. Рынак працы дэманструе стабільнасць: колькасць вакансій павялічылася, а ўзровень беспрацоўя застаецца вельмі нізкі. Служба занятасці дапамагла знайсці працу амаль 10 тысячам чалавек, з якіх 2700 былі беспрацоўнымі.

### УВАГА ЛЮДЗЯМ

Юрый Караеў таксама падкрэсліў важнасць сацыяльнай скіраванасці палітыкі. Асноўны фокус — на падтрымку сельскіх жыхароў. Важна забяспечыць доступ да якасных тавараў і паслуг, а таксама стварыць умовы для замацавання маладых спецыялістаў у сельскіх раёнах.

— Жыхары сельскай мясцовасці — гэта тыя, хто стварае нашу краіну, не думаючы аб матэрыяльнай узнагародзе нават у самыя складаныя часы. Сёння клопат аб іх становіцца ключавой задачай. І размова ідзе не толькі аб сельскагаспадарчых работах або перыядах збору ўраджаю. Падтрымка павінна быць пастаяннай: ад якасці работы магазінаў і медыцынскіх устаноў да стану дарог, дзіцячых садкоў і школ, — падкрэсліў Юрый Караеў.

У першым паўгоддзі ў эканоміку рэгіёна паступіла звыш 2,2 мільярда рублёў інвестыцый. Паступленні ў бюджэт перавысілі запланаваныя паказчыкі. Знешні гандаль таксама дэманструе станоўчую дынаміку: экспарт тавараў і паслуг перасягнуў імпарт, што забяспечыла рэгіёну дадатнае сальда.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПЕНСІІ, ЗАРОБКІ І ПАПРАЎКІ Ў ПДР

## Што зменіцца з 1 верасня?

З пачаткам восені ў Беларусі чакаецца шэраг важных змяненняў, якія закрануць кожнага з нас. Будзе праведзены пераразлік пенсій, у бюджэтнікаў вырастуць заробкі, пачнецца сезон сельскагаспадарчых кірмашоў з прывабнымі цэнамі і шырокім асартыментам прадукцыі. Акрамя таго, уступаюць у дзеянне змяненні ў Правілы дарожнага руху, вырастуць тарыфы на праезд па платных дарогах. Таксама на шэсць месяцаў уводзіцца ліцэнзаванне вывазу яблыкаў. Мы высветлілі падрабязнасці таго, як усё гэта будзе адбывацца.



### ПРЫЕМНАЯ НАВІНА ДЛЯ 2,3 МІЛЬЁНА ПЕНСІЯНЕРАЎ...

